# Пытанні адукацыі — на кантролі дэпутатаў

**Выязная сесія Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў была прысвечана рэалізацыі дзяржаўных праграм у сферы адукацыі. Дэпутаты наведалі ў Гродне Цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі, яслі-сад № 101, спецыяльную агульнаадукацыйную школу-інтэрнат для дзяцей з парушэннямі слыху, Гродзенскую гарадскую гімназію, каледжы — прафесійны тэхналагічны і тэхнікі, тэхналогій і дызайну.**

Перад пачаткам работы сесіі, якая прайшла ў Гродзенскім абласным інстытуце развіцця адукацыі, дэпутаты азнаёміліся з выставай "Сучасны навучэнец — мабільны навучэнец", дзе былі прадстаўлены распрацоўкі педагогаў Гродзеншчыны.

Начальнік упраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама дэпутат абласнога Савета Аляксандр Сонгін расказаў аб выкананні дзяржаўных праграм у сферы дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, на якія было выдзелена 1439,2 млрд рублёў.

За перыяд рэалізацыі праграм у Гродзенскай вобласці пабудаваны 4 школы і 16 дзіцячых садоў. Асноўным дасягненнем рэалізацыі Праграмы развіцця дашкольнай сістэмы адукацыі Аляксандр Генрыхавіч назваў яе захаванне, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, павышэнне прафесійнага ўзроўню педагогаў. Ахоп дзяцей дашкольнай адукацыяй самы высокі ў краіне — 74,7 працэнта, а пропуск дзяцей па хваробе складае 4,4 дня, што ніжэй за рэспубліканскі ўзровень.



Настаўнік працоўнага навучання Мураванаашмянкеўскага яслаў-сада — сярэдняй школы Генадзій Швабовіч прадстаўляе сваю распрацоўку "Чарчэнне ў 3D".

Адзначаючы станоўчыя вынікі выканання кожнай праграмы, А.Г.Сонгін паказаў і праблемы, якія існуюць у галіне. Так, застаецца праблемай крокавая даступнасць дашкольных устаноў для Гродна, Ліды, Навагрудка, Шчучына. 41 працэнт выхавальнікаў не маюць профільнай дашкольнай адукацыі.

Пяць гадоў Гродзенская вобласць лідзіруе ў рэспубліканскім конкурсе "Камп'ютар. Адукацыя. Інтэрнэт", адны з лепшых паказчыкаў дэманструе па выніках ЦТ, другое места заняў рэгіён у гэтым годзе па выніках рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах. Развіваюцца дыстанцыйныя формы павышэння кваліфікацыі педагогаў, фарміруецца адукацыйнае асяроддзе на базе воблачных тэхналогій. Праблемай застаецца замацаванасць кадраў — толькі 70,6 працэнта замацоўваюцца на месцах. Ёсць пытанні па аплаце працы і забеспячэнні настаўнікаў жыллём.

У 54 установах адукацыі створана безбар'ернае асяроддзе. У кожным раёне вобласці вылучаны апорныя ўстановы адукацыі для інтэграванага навучання і выхавання дзяцей з асаблівасцямі развіцця.

За 2011—2015 гады на Гродзеншчыне падрыхтавана 20,5 тысячы спецыялістаў з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, павысілі кваліфікацыю 1662 педагогі. Асаблівай увагі патрабуе сёння забеспячэнне выпускнікоў першым рабочым месцам.

Пад такой павышанай увагай знаходзяцца і пытанні выхавання. А.Г.Сонгін расказаў дэпутатам аб найбольш цікавых і знакавых праектах — маладзёжным парламенце, праекце "Крыніцы Гродзеншчыны", антынаркатычным руху "ВЕК" і інш. Сёння з'яўляюцца і новыя праекты, напрыклад, "Культурная субота", які аб'ядноўвае дзеянні сістэмы адукацыі, культуры і спорту.

На пасяджэнні выступіла намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама Зоя Кулеша, якая прадставіла работу сістэмы адукацыі Гродна. Прарэктар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Юрый Бялых сваё выступленне прысвяціў узаемадзеянню ГрДУ і ўпраўлення адукацыі аблвыканкама і рабоце агульнага каардынацыйнага савета, паведаміў аб рабоце па забеспячэнні якаснага набору на педагагічныя спецыяльнасці праз праграму "Прызванне — педагог", работу з адоранай і таленавітай моладдзю. Так, ва ўніверсітэце актыўна практыкуецца правядзенне алімпіяд для школьнікаў, у тым ліку дыстанцыйных, уключэнне навучэнцаў школ у навуковую дзейнасць, створана 29 філіялаў кафедраў у школах і гімназіях горада.

Аб рабоце сваіх устаноў расказалі дэпутаты абласнога Савета — дырэктар сярэдняй школы № 7 Смаргоні Аляксандр Джумкоў і дырэктар Навагрудскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага ліцэя сельскагаспадарчай вытворчасці Эльвіра Сарока.

Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Ігар Жук адзначыў, што ў сістэме адукацыі вобласці за апошнія гады зроблена шмат, ёсць нямала падстаў ганарыцца яе дасягненнямі. З гэтым пагадзіліся старшыня пастаяннай камісіі па навуцы, адукацыі і культуры Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандр Сягоднік і намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Лісковіч, якія прынялі ўдзел у рабоце сесіі. Яны ж выказалі і шэраг прапаноў па паляпшэнні работы сістэмы адукацыі вобласці.

Дэпутаты прынялі рашэнне аб тым, што штогод на сесіях саветаў рознага ўзроўню будуць разглядацца пытанні рэалізацыі новай Дзяржаўнай праграмы "Адукацыя і маладзёжная палітыка" на 2016—2020 гады. Было рэкамендавана Ваўкавыскаму, Дзятлаўскаму, Зэльвенскаму, Іўеўскаму, Карэліцкаму, Мастоўскаму, Ашмянскаму, Свіслацкаму, Слонімскаму і Шчучынскаму саветам дэпутатаў разгледзець у адпаведнасці з заканадаўствам пытанне аб падтрымцы педагагічных работнікаў, якія працуюць вынікова. Упраўленню адукацыі разам з ГрДУ імя Янкі Купалы прапанавана арганізаваць на бюджэтнай форме перападрыхтоўку педагагічных работнікаў устаноў дашкольнай адукацыі, якія не маюць профільнай адукацыі, па кірунку "Педагогіка дзяцінства".

**Надзея ВАШКЕЛЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**